УДК 392(476)

# Уплыў вясковай грамадскай думкі на жыццё беларускіх сялян у другой палове XIX-пачатку XX стагоддзя

Карбалевіч Н.М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Вясковая грамадская думка з’яўлялася важнейшым элементам грамадскіх узаемаадносінаў беларускіх сялян у другой палове XIX–пачатку XX стагоддзя. Кожны селянін штохвілінна быў аб’ектам грамадскай увагі, а ўсеагульная дасведчанасць аб здольнасцях і жыцці кожнага селяніна была асновай грамадскіх узаемаадносінаў, што з’яўлялася таксама эфектыўнай формай рэгуляцыі і кантролю ў сялянскім асяродку. Грамада дакладна ведала пра стан гаспадаркі кожнай сям’і, пра яе асаблівасці і складанасці. Пры гэтым грамадскі асяродак быў не проста пасіўным назіральнікам, але і актыўна выказваў свае меркаванні і парады наконт прыватных спраў селяніна. Сярод тэм, якія маглі абмяркоўвацца, фактычна не было забароненых, аб’ектам пільнай увагі грамады мог стаць любы аспект жыцця селяніна. Традыцыйна ўвагу грамадскага асяродку выклікала знешнасць, асабістае жыццё сялян. Асабліва пільную ўвагу выклікалі любыя адхіленні ад нормы ва ўсіх сферах, пачынаючы ад дробязяў і завяршаючы трагічнымі выпадкамі. Асаблівую грамадскую ўвагу выклікала з’яўленне ў гаспадарцы нейкай новай рэчы, прычым неабавязкова навінкі ў побытавай сферы, але і цалкам звычайнага прадмету гаспадаркі. Уплыў грамадскай думкі асабліва моцным быў на незамужніх дзяўчат, для якіх рэпутацыя была важнейшым фактарам добрага шлюбу. Уплыў грамадскага меркавання ў сялянскім асяродку быў вельмі значным, а ў фальклоры замацавана паважлівае стаўленне да грамадскай думкі. Грамадская думка, і нават страх перад ёй, вельмі моцна ўплывала на паводзіны сялян, тым самым з’яўляючыся ўплывовай сілай у жыцці грамады. Грамадскае меркаванне, заснаванае на добрай дасведчанасці грамады аб жыцці кожнай сялянскай сям’і, з’яўлялася важкім сведчаннем ў юрыдычных справах. Любое адхіленне ад стандарту паводзінаў выклікала актыўную рэакцыю грамадскую асяродку. Грамадская думка мела рэальныя рычагі ўплыву на жыццё сялян і цалкам рэалістычна магла змяніць чалавечы лёс. З улікам гэтага фактару сяляне карэктавалі свае паводзіны, каб не патрапіць пад асуджэнне грамады і пазбегнуць складанасцяў у грамадскіх ўзаемаадносінах. Такім чынам, грамадская думка ў сялянскім асяродку з’яўлялася эфектыўным механізмам рэгуляцыі грамадскіх узаемаадносінаў.